**УДК 94(=112.2)(476)«17/19»**

# «ПРАМЯНІСТАЯ ЗОРКА НА ГАРЫЗОНЦЕ ЧАЛАВЕЦТВА»: РОД НЕМЦАЎ ГІНДЭНБУРГАЎ У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*Снапкоўскі Ю. М.*
Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, Мінск, Беларусь

*Беларускія землі з'яўляліся адным з самых стракатых у этнаканфесійным плане рэгіёнаў Расійскай імперыі, што актуалізуе праблему наяўнасці ў складзе тагачаснага беларускага соцыуму розных этнаканфесійных груп, іх узаемадзеяння, узаемакультурнага ўплыву і ўкладу ў развіццё рэгіёна. У межах гэтых груп, у сваю чаргу, назіраецца прысутнасць прышлага (іншаземнага) насельніцтва. Працэс сацыяльнай адаптацыі былых іншаземных (прускіх) падданых і замацавання іх у пэўных саслоўных колах беларуска-літоўскіх губерняў добра прасочваецца на прыкладзе некалькіх пакаленняў немцаў-лютэран Гіндэнбургаў, якія праявілі сябе як адны з лепшых прадстаўнікоў мясцовага служылага дваранства, адыграўшы прагрэсіўную ролю ў грамадстве.*

*Ключавыя словы: Гіндэнбургі (Гінтэрбургі); немцы; іншаземцы; насельніцтва; Рэч Паспалітая; Расійская імперыя; беларускія землі; беларуска-літоўскія губерні; Мінск; Мінскі павет; Мінская губерня; евангелічна-лютэранская царква; Мінскі дваранскі дэпутацкі сход; фальсіфікацыя дакументаў; шляхецкі вывад; сацыяльная мабільнасць; міграцыя; дабрачыннасць; шляхта; дваранскія роды; памешчыкі; службовыя асобы; рамеснікі; лекары; лютэране; 1790-я гады; мяжа XVIII–XIX стст.; XIX ст.*

# «A SHINING STAR ON THE HORIZON OF THE HUMANKIND»: GERMAN HINDENBURG FAMILY IN THE HISTORY OF BELARUS

*Snapkouski Y.*
National Historical Archives of Belarus, Minsk, Belarus

*Belarusian lands had one of the most diverse ethnical and confessional landscapes among regions of the Russian Imperia. It actualizes the question about presence inside of those Belarusian social context different ethnical and confessional (religious) groups, their intercommunion, mutual cultural influences, their contribution to the development of the region. Inside of the local ethnic and confessional groups can be noticed the presence of newcomers from other countries. The article illustrates the process of the social adaptation of former foreign citizens (from Prussia) and their entrench at concrete social class of Belarusian-Lithuanian provinces. The example that was described by the author of the article was the German-Lutheran Hindenburg family in several generations. They manifested themselves as one of the best representers of the local noble-officials and played a progressive role in the society.*

*Keywords: the Hindenburg (Hinterburg) family; Germans; foreigners; population; Polish-Lithuanian Commonwealth; Russian Empire; Belarusian lands; Belarusian-Lithuanian provinces; Minsk; Minsk District; Minsk Province; Evangelical Lutheran Church; Minsk Assembly of Noble Deputies; falsification of documents; proof of nobility; social mobility; migration; philanthropy; shliakhta; noble families; landlords; officials; artisans; doctors; Lutherans; 1790s; the turn of the XVIII–XIXth centuries; XIXth century.*

Насельніцтва беларускіх зямель, якія ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай увайшлі ў склад Расійскай імперыі, яскрава вылучалася сваёй поліэтнічнасцю і поліканфесійнасцю. Не з'яўлялася яно аднародным і па больш дынамічнай прымеце – сацыяльнай. Гэта неаднароднасць у значнай ступені падтрымлівалася, трэба думаць, разнастайнымі міграцыйнымі працэсамі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Адным з самых складаных і малавывучаных пытанняў застаецца наяўнасць у структуры насельніцтва наваўтвораных беларуска-літоўскіх губерняў этнаканфесійных груп, прадстаўнікі якіх мелі іншаземнае паходжанне. Айчынная гістарыяграфія на працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў зрабіла першыя крокі ў вывучэнні толькі асобных дваранскіх родаў і постацяў іншаземнага паходжання, якія пакінулі свой след у жыцці Беларусі [1; 16; 17; 68; 72; 74; 86].

Выдадзены ў 2012 г. Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі зборнік дакументаў «Иностранные подданные в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.)» [21] не толькі адкрыў навуковай грамадскасці цэлыя дакументальныя комплексы па зададзенай праблематыцы, але і паспрыяў асэнсаванню ў межах яе новых накірункаў і перспектыў даследавання. Між іншым, гэта выданне падкрэсліла неабходнасць усведамлення таго, што агульная маса іншаземцаў, якія аселі на землях былога Вялікага Княства Літоўскага, сама не была аднароднай ні па этнічнай, ні па канфесійнай, ні па сацыяльнай прыметах.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай іншаземцы (як іншаземныя падданыя, так і расійскія падданыя іншаземнага паходжання) разам з усімі катэгорыямі аўтахтоннага насельніцтва беларускіх зямель былі інкарпараваны ў сацыяльна-прававы кантэкст расійскай гісторыі. Адным з прыярытэтных напрамкаў унутранай палітыкі царскіх улад з'яўлялася скарачэнне тут шматлікага прывілеяванага саслоўя – шляхты. Для большасці шляхецкага насельніцтва, якое вылучалася беззямельным становішчам і малапісьменнасцю, гэтыя абмежавальныя мерапрыемствы, безумоўна, павінны былі абярнуцца сапраўднай сацыяльнай

катастрофай, калі прадстаўнікі шляхецкіх колаў гублялі свае старыя прывілеі і залічваліся ў падатны стан. Выйсце з такой сітуацыі дробная шляхта пры актыўнай і ўзаемавыгаднай падтрымцы з боку афіцыйна створаных органаў мясцовай дваранскай карпарацыі – дваранскага дэпутацкага сходу і інстытута губернскага і павятовых маршалкаў – знайшла ў фальсіфікацыі дакументаў, на падставе якіх дамагалася быць зацверджанай у дваранскай годнасці. Агульнаімперская працэдура доказу высакароднага паходжання не абмінула і іншаземцаў, што імкнуліся замацавацца ў складзе расійскага дваранства. Улічваючы сацыяльную неаднароднасць тых груп іншаземцаў, якія ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. легітымізоўваліся праз дваранскія дэпутацкія сходы беларуска-літоўскіх губерняў, умоўна вылучым сярод іх наступныя катэгорыі:

1) знатныя роды, якія карысталіся правамі прывілеяванага саслоўя яшчэ да пераезду ў Рэч Паспалітую ці Расійскую імперыю;

2) нязнатныя роды, якія атрымалі дваранства падчас службы ў Рэчы Паспалітай ці Расійскай імперыі;

3) нязнатныя роды, якія дамагаліся дваранства ў Расійскай імперыі на падставе сфальсіфікаваных дакументаў.

У гістарычнай літаратуры размова звычайна ідзе толькі пра дзве першыя з трох названых катэгорый. Пытанне пра магчымасць фальсіфікацыі дакументаў, якія падаваліся прадстаўнікамі родаў іншаземнага паходжання ў доказ дваранства, не ставіцца нават у спецыялізаваных крыніцазнаўчых працах [17]. Верагоднасць рэтраспектыўнай інфармацыі ў вывадовых дэкрэтах і дваранскіх справах, на жаль, часта апрыёры ўспрымаецца даследчыкамі бясспрэчнай, без належнага крытычнага аналізу крыніц. Разам з тым трэба адзначыць, што пэўны баланс у гэтым накірунку цягам апошняга дзесяцігоддзя ўсё ж быў дасягнуты аўтарамі пяці тамоў «Гербоўніка беларускай шляхты» [7–11], дзе разам з пакаленнымі роспісамі прадстаўлены глыбокі крыніцазнаўчы аналіз дакументацыі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу.

Відавочна, што сацыяльнае паходжанне дбаючых аб дваранстве нязнатных іншаземцаў з'яўлялася для іх асноўным камнем спатыкнення на шляху да інкарпарацыі ў прывілеяваны стан, бо менавіта ад гэтага крытэрыю залежаў не толькі характар шляхецкіх вывадаў, але і само іх правамоцтва. Каб разумець наяўнасць і сутнасць разглядаемай праблемы, неабходна як уважлівае кампаратыўнае вывучэнне матэрыялаў дваранскіх дэпутацкіх сходаў і іншых незалежных ад вывадовай

дакументацыі крыніц, так і прыняцце ў разлік некаторых сацыяльна-культурных і дэмаграфічных асаблівасцяў беларуска-літоўскіх губерняў канца XVIII – пачатку XIX ст.

Для іншаземцаў, якія асядалі на беларускіх землях, працэс сацыяльнай адаптацыі праходзіў без асаблівых цяжкасцяў, тым больш калі ўлічыць іх выразную лаяльнасць да расійскай адміністрацыі. Нягледзячы на пераломны характар перыяду айчыннай гісторыі (падзелы Рэчы Паспалітай), многія іншаземцы апынуліся тут у даволі спрыяльных умовах для прымянення сваіх прафесійных здольнасцяў і павышэння ўзроўню матэрыяльнага дабрабыту. На тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў, у прыватнасці Мінскай, асядалі цэлыя сем'і замежных (нямецкіх, французскіх і інш.) купцоў, вучоных і рамеснікаў (механікаў, архітэктараў, аптэкараў, зэгармайстраў, сталяроў, гарбароў, краўцоў, пекараў, каўбаснікаў, піваваараў і інш.) [21, с. 390–397]. Пры гэтым далёка не кожны з прадстаўнікоў адпаведных колаў мясцовага насельніцтва мог канкурыраваць з гэтымі замежнікамі па майстэрству, здольнасцям і стракатасці спецыялізацыі. Тутэйшыя памешчыкі, а таксама прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады і гарадскога самакіравання запрашалі іншаземных спецыялістаў весці праектна-будаўнічыя работы, паляпшаць вытворчасць прадпрыемстваў і ўсяляк удасканальваць умовы жыцця ў новаўтворанай Мінскай губерні і яе адміністрацыйным цэнтры. Больш за тое, становішча іншаземцаў у значнай ступені паляпшала тая акалічнасць, што пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай яны, паводле кантрактнай сістэмы, разам з мясцовымі купцамі і рамеснікамі на некалькі год вызваляліся ад прамога падаткаабкладання [35, арк. 1; 91, с. 367].

На мяжы XVIII–XIX стст. паслугі замежных спецыялістаў і рамеснікаў аказаліся настолькі запатрабаванымі, што некаторыя з наймальнікаў ператвараліся ў іх даўжнікоў, не маючы належных сродкаў, каб своечасова заплаціць ім за працу. У асобных выпадках землеўладальнікі былі вымушаны сваім замежным наймітам перадаваць па эксдывізіі частку ўласных маёнткаў. Карыстаючыся момантам, некаторыя здольныя і рашучыя замежныя спецыялісты ў пачатку XIX ст. сталі ўкладваць зробленыя грошы ў нерухомую маёмасць і нават набываць сялянскія душы. Такое квітнеючае становішча гэтай катэгорыі замежнікаў адкрывала для іх новыя гарызонты. Маючы зямлю, грошы і пэўны аўтарытэт у мясцовым асяроддзі, яны маральна ўжо былі гатовыя да таго, каб пры першай магчымасці раз і назаўсёды

пазбавіцца свайго падатнага стану і любымі сродкамі замацавацца ў вярхах сацыяльнай лесвіцы, забяспечыўшы сваіх дзяцей годнай будучыняй. У юрыдычным сэнсе гэта азначала набыццё дваранства, што для іх магчыма было зрабіць праз мясцовы дваранскі дэпутацкі сход толькі шляхам фальсіфікацыі адпаведных дакументаў і стварэння міфалагізаванага шляхецкага радаводу. Як справядліва адзначае гісторык А. І. Сяліцкі, трэба прызнаць, што акрамя тых асоб, якія пасля падзелаў Рэчы Паспалітай законна прэтэндавалі на пацвярджэнне свайго шляхецтва, да паслуг канцылярскіх «махляроў» маглі звяртацца і незаконныя прэтэндэнты з іншых саслоўяў [67, с. 115]. Таму распачатая расійскімі ўладамі ўніжальная для мясцовай знаці працэдура доказу шляхецкага паходжання мела і адваротны бок, калі яна адчыняла «шырокі шлях для папаўнення дваранства прадстаўнікамі ніжэйшых саслоўяў, што было амаль немагчыма зрабіць афіцыйна ў часы Рэчы Паспалітай» [67, с. 109].

Адным з самых яскравых прыкладаў такой сацыяльна-прававой метамарфозы з’яўляецца, на наш погляд, справа аб дваранстве Гіндэнбургаў – рамеснікаў з Прусіі, якім пашчасціла быць запісанымі ў самую элітную – шостую – частку дваранскай радаводнай кнігі Мінскай губерні як «старажытны дваранскі род».

У той жа час гісторыя Гіндэнбургаў дэманструе і тыя асобныя выпадкі сацыяльнай эскалацыі сярод насельніцтва беларускіх земляў, у выніку якіх фарміраваліся цэлыя генерацыі служылага дваранства, адметныя сваёй прагрэсіўнай роляй у грамадстве. У службовай біяграфіі нашчадкаў (у 2, 3 і 4-м каленах) прускага рамесніка мы сустракаем пасады як павятовага і гарадскога ўзроўняў (павятовы скарбнік, акцызны наглядчык, участковы і гарадскі судовыя следчыя, гараднічы, галоўны доктар бальніцы і інш.), так і губернскага (акушэр урачэбнай управы, прэзідэнт таварыства лекараў, канцылярскі чыноўнік пры губернатары, таварыш пракурора акруговага суда, чыноўнік па судовай частцы пры губернскім




*Мал. 1.* **Вокладка справы Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Гіндэнбургаў**

акцызным упраўленні, член губернскай прысутнасці, член аддзялення Дзяржаўнага дваранскага зямельнага банка, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў, загадчык спраў люстрацыйнай камісіі і інш.)[18]. Яго старэйшы сын Вільгельм Данілавіч (акушэр) і ўнук Леапольд Вільгельмавіч (хірург і тэрапеўт) Гіндэнбургі ўвогуле сталі выбітнымі лекарамі, якіх за высокі прафесіяналізм, ахвярную самаадданасць і вельмі чулыя адносіны да хворых сучаснікі называлі «двайнікамі» «святога доктара» Гааза [3, с. 382; 62, с. 319; 66, с. XIII], а першым з іх захапляўся нават рускі пісьменнік Ф. М. Дастаеўскі [4, с. 107–120, 145].

## «Механік, гідраўлік, архітэктар»: Даніэль Паўлавіч Гінтэрбург-Гіндэнбург (каля 1761 – пасля 1833)

Знойдзеныя намі нешматлікія архіўныя дакументы толькі скупымі штрыхамі малююць дакладныя эпізоды ранняй гісторыі роду Гіндэнбургаў. Аднак з моманту нашых апошніх публікацый пяцігадовай даўніны [70; 71], паводле якіх родапачынальнік – Даніэль Гінтэрбург (Гінтэнберг) – быў млынавым майстрам і будаваў у 1794–1796 гг. у горадзе Мінску на замову млыны, нам удалося яшчэ крыху прасунуцца ў высвятленні абставін і часу з’яўлення на Міншчыне гэтага немца. У прыватнасці, у метрычных кнігах Каралішчавіцкага Марыінскага касцёла намі быў знойдзены запіс аб нараджэнні 9 жніўня 1791 г. у бацькоў «германскай нацыі лютэранскай канфесіі» Даніэля і Даратэі, народжанай Флік (Flick), Гінтэрбургаў (Hinterburg) з эканоміі Ельніца сына Самуэля-Багуміла-Лаўрэнція, якога праз пяць дзён, 14 жніўня, хрысціў настаяцель Каралішчавіцкай парафіі ксёндз Антоні Сакалоўскі [49, арк. 9]. Хроснымі бацькамі запісаны «высокаблагародны пан» Станіслаў Прушынскі, генерал-ад’ютант караля Рэчы Паспалітай, і яго жонка Ганна, а ў ліку прысутных на хрышчэнні – іх дачка Альжбета.

З гэтага лаканічнага метрычнага запісу вынікае некалькі цікавых і важных акалічнасцяў.

Па-першае, немцы Гіндэнбургі (Гінтэрбургі) з’явіліся на тэрыторыі Мінскага краю яшчэ пры Рэчы Паспалітай (паміж 1-м і 2-м яе падзеламі).

Па-другое, што асабліва важна, адно з першых (калі не першапачатковае) месцаў пражывання Гіндэнбургаў у Рэчы Паспалітай звязанае з эканоміяй Ельніца, якая знаходзілася ў складзе буйнога памешчыцкага маёнтка Каралішчавічы Мінскага павета. Гэты маёнтак

[18] Гл. падрабязна: [71].

належаў прадстаўніку элітных колаў служылай арыстакратыі Рэчы Паспалітай Станіславу Юзафавічу Прушынскаму (1753–1800), суддзі Галоўнага Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага (у 1779–1780 гг.), генерал-ад'ютанту апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, ігуменскаму павятоваму маршалку (з 1797 да 1800 г.).

Той факт, што ён, сам уладальнік маёнтка, і яго жонка Ганна Гектараўна, народжаная графіня Камароўская, як хросныя бацькі разам з іх старэйшай 12-гадовай дачкой Альжбетай, будучай жонкай тайнага саветніка Вікенція Іванавіча Гячэвіча, мінскага цывільнага губернатара (з 1818 да 1831 г.) і сенатара (з 1831 да 1840 г.), прысутнічалі на хрышчэнні дзяцей Даніэля Гінтэрбурга, сведчыць аб даволі блізкіх і цёплых стасунках паміж гэтым немцам і сям'ёй Прушынскіх. Можна нават выказаць думку, што адораны спецыяліст (механік і архітэктар) Даніэль Гінтэрбург трапіў у Рэч Паспалітую як іншаземны найміт Станіслава Прушынскага дзеля будаўнічых работ у яго квітнеючым маёнтку. Наша меркаванне выглядае небеспадстаўным, асабліва ў святле знойдзеных намі ў рэвізскіх сказках звестак аб пражыванні ў 1795 г. «паводле кантракту з уладальнікам» на тэрыторыі маёнтка Каралішчавічы – як раз у вёсцы Ельніца – трох сем'яў «замежных французаў» лютэранскага веравызнання [45, арк. 171 адв. –172].

Па-трэцяе, метрычны запіс падае нам самы ранні варыянт прозвішча родапачынальніка – «Hinterburg». І менавіта гэты варыянт трэба разглядаць як найбольш дакладны, і не толькі з-за таго, што перад намі фактычна першая пісьмовая згадка пра род Гіндэнбургаў, але і таму, што такая ж форма прозвішча фігуруе, у тым ліку ў рускай транслітарацыі («Гинтербург»), у афіцыйных дакументах 1795–1797 гг. ужо пры Расійскай імперыі [33, арк. 57 адв.; 34, арк. 1; 47, арк. 18, 49]. Асобныя дакументы за 1795–1800 гг. паслядоўна ўтрымліваюць таксама наступныя варыянты прозвішча: «Hińtemburg» [35, арк. 22], «Гитенберг» [26, арк. 37–37 адв.], «Гентенберг» [33, арк. 130], «Гинтенбурк» [28]. У больш позніх крыніцах – за 1810 і 1811 гг. – прозвішча трапляецца ў формах «Hitemberg» [38, арк. 40 адв. –42 адв.], «Hitenburch» [65, арк. 265] і «Гинтенбурх» [65, арк. 265].

Дарэчы, нас не павінны здзіўляць тыя абставіны, што лютэране хрысцяць сваё дзіця ў рымска-каталіцкім касцёле. У 1790-я гг. Мінская лютэранская супольнасць, нямецкая па сваім нацыянальным абліччы, толькі фарміравалася і доўгі час не мела свайго пастаяннага пастара. Таму, каб пахрысціць сваіх нованароджаных дзяцей, мінскія лютэране

былі вымушаны альбо вазіць іх у бліжэйшыя пратэстанцкія цэрквы (лютэранскія кірхі ў Вільні і Слуцку ці рэфармацкі збор у Койданава), альбо, што было больш зручным, хрысціць іх у мясцовых рымска-каталіцкіх касцёлах Мінска і Мінскага павета. Вядома, што ў 1796 г. у Мінску часова служыў былы пастар Слуцкай (з 1793 да 1795 г.) і Магілёўскай (з 1795 да 1796 г.) лютэранскіх цэркваў Карл-Людвіг Гэмэрых (Hemmerich) [23, с. 57, 59, 60; 93]. І толькі з прызначэннем у 1798 г. сюды ў якасці пастаяннага пастара Самуэля Карштадта (Karstadt, Karstaedt), які раней (з 1790 да 1793 г.) служыў у горадзе Няміраве Падольскага ваяводства, была ўтворана асобная Мінская евангелічна-лютэранская парафія [23, с. 56–57; 94]. Набажэнствы ў Мінску лютэране тады праводзілі ў старым драўляным будынку былой уніяцкай царквы «на Замчышчы» (у раёне сучаснай станцыі мятро «Няміга») [22, с. 90]. Пастар Карштадт узначальваў Мінскую евангелічна-лютэранскую парафію больш за 30 гадоў (з 1798 да 1831 г.) і з сям'ёй Гіндэнбургаў, аб чым сведчаць архіўныя дакументы, ён падтрымліваў вельмі цесныя стасункі. Як адзначае расійская даследчыца В. В. Курыла, «аб'ядняльным пачаткам для нямецкага насельніцтва, што пражывала ў чужым нацыянальным і канфесійным асяроддзі, рабілася лютэранскае веравызнанне, якога прытрымлівалася большасць расійскіх немцаў» [24, с. 77].

Нешматлікае, але даволі збітае канфесійнае брацтва немцаў-лютэран ужо на мяжы XVIII–XIX стст. адыгрывала значную ролю ў жыцці губернскага Мінска. Немцаў паводле этнічнага паходжання і адначасова лютэран паводле веравызнання можна было сустрэць тут сярод прадстаўнікоў розных сацыяльных пластоў і сфер дзейнасці – ад рамеснікаў да чыноўнікаў мясцовага апарата ўлады. З ліку апошніх вылучаюцца фігуры мінскага цывільнага губернатара Германа-Густава Іванавіча фон Радынга (von Rading), губернскага пракурора Івана Пятровіча фон Шуца (von Schütz), губернскага архітэктара Фрыдрыха Хрысціянавіча фон Крамэра (von Cramer), асэсара казённай палаты Фёдара Данілавіча фон Аларда (von Allard), якія належалі да дваранскага саслоўя і нароўні з Даніэлем Гіндэнбургам ідэнтыфікавалі сябе з членамі «евангелічнай супольнасці ў Мінску» («Die Evangelische Gemeinde in Minsk») [51, арк. 1 адв., 5.].

Спачувальную пазіцыю ў адносінах да мінскіх лютэран займаў выхадзец «з дваран нацыі нямецкай» секунд-маёр Пётр Іванавіч Цэйс (Zeiß) – першы мінскі гараднічы (з 1793 да 1795 г.), а затым (з 1797 г.) саветнік Мінскай казённай палаты [40, арк. 13 адв. – 16]. У канцы 1801 г.

ён прадаў лютэранскай супольнасці пад царкву і іншыя будыніны «ў вечнае і спадчыннае валоданне» ўласны драўляны дом на каменным падмурку з сумежнай зямлёй за 2500 руб. сярэбранай манетай [50, арк. 7–7 адв.]. З таго часу ў мінскіх лютэран быў свой будынак царквы, які размяшчаўся па вуліцы Дамініканскай (сёння – вуліца Энгельса) побач з перасячэннем з вуліцай Захар'еўскай (сёння – праспект Незалежнасці).

У працяг размовы пра новыя крыніцы адносна пачаткаў роду Гіндэнбургаў у Беларусі трэба сказаць, што запісы аб нараджэнні яшчэ некаторых дзяцей лютэраніна Даніэля Гінтэрбурга намі таксама былі знойдзены ў метрычных кнігах рымска-каталіцкага касцёла, але ўжо Мінскага Марыінскага (з 1798 г. – кафедральнага). Так, 1 мая 1795 г. у бацькоў «лютэранскай канфесіі» Даніэля і Даратэі Гінтэрбургаў (прозвішча фігуруе ў форме «Hinterburch») нарадзілася дачка Алена-Ганна і была хрышчана ў гэтым касцёле на трэці дзень [47, арк. 18]. 24 чэрвеня 1797 г. у іх жа, бацькоў «германскай нацыі», нарадзіўся сын Іяган-Фердынанд, якога на наступны дзень хрысціў вікарый Мінскага Марыінскага касцёла Фабіян Чарняўскі [47, арк. 49]. Калі ў першым з гэтых двух метрычных запісаў дакладнае месца нараджэння дзіцяці не пазначана, то ў другім выпадку месцам нараджэння названа Ляхаўка (прадмесце Мінска). Таму, улічваючы, што Даніэль Гінтэрбург спецыялізаваўся на будаванні млыноў для горада, можна выказаць меркаванне аб яго ўдзеле ў фарміраванні тапаграфічнага аб'екта, які на распрацаваным і зацверджаным у гэты час першым праектным плане Мінска зафіксаваны як «Ляхаўскія млыны» [2].

Перапіс іншаземных жыхароў Мінска за 1795 г. больш дакладна акрэслівае геаграфічнае паходжанне Даніэля Паўлавіча Гінтэмбурга (Hińtemburg) – з Прусіі, упершыню называе яго ўзрост – 34 гады (каля 1761 г. нар.), узрост яго жонкі Дароты Даніэлеўны – 25 год (каля 1770 г. нар.), а таксама разгорнута вызначае яго спецыялізацыю – «механік, гідраўлік, архітэктар, які практыкуе і пражывае ў горадзе Мінску паводле кантракту» [35, арк. 22]. Калі ўлічыць, што ў 1796–1800 гг. Даніэль Гіндэнбург арандаваў у Пінскага Багаяўленскага манастыра ўчастак зямлі з цагельным заводам (былая ўласнасць Мінскага Петрапаўлаўскага мужчынскага манастыра) пры фальварку Пярэспа Мінскага павета [28], то становіцца зразумелым, што ён быў не проста рамеснікам, але сапраўдным спецыялістам шырокага профілю, бо, маючы ўласны рэсурс (цэглу), мог узяць на сябе выкананне ўсяго спектра праектных і будаўнічых работ пры ўзвядзенні новых млыноў. Мяркуючы з усяго,

паслугі гэтага вучонага немца ў нядаўна заснаванай губернскай сталіцы і яе ваколіцах не засталіся незапатрабаванымі, і за дзесяцігоддзе сваёй прафесійнай дзейнасці прадпрымальны Даніэль Гіндэнбург, відаць, назбіраў значнае багацце, што дазволіла яму ў 1805 г. не толькі атрымаць паводле эксдывізіі з памешчыцкага маёнтка Прылепы Мінскага павета (уласнасць мінскага павятовага казначэя Аўласа Фёдаравіча Мяжэніна) фальварак Вільгельмаўку (названы ім так, трэба думаць, у гонар старэйшага сына), але і набыць там чатыры душы прыгонных мужчынскага полу. Таму ў рэвізскай сказцы ад 15 снежня 1811 г. ён зафіксаваны ўжо як «дзедзічны ўладальнік», які, акрамя таго, арандуе ў веляціцкага старосты графа Юзафа Міхалавіча Тышкевіча фальварак Высокае Мінскага павета з 35 рэвізскімі душамі мужчынкага полу (паводле рэвізіі 1795 г.) [65]. Вясной 1815 г. Гіндэнбург набывае ў былога лоўчага мінскага Тадэвуша Варанца засценак Стадолішча Мінскага павета і пачынае скупаць у жонкі капітана расійскіх войскаў Юстыны Янкоўскай прылеглыя да гэтага засценка землі [12, арк. 10 адв. – 11; 57, арк. 549 адв. –550].

У выніку такой паспяховай сацыяльна-маёмаснай эскалацыі ўчарашняму прускаму рамесніку заставалася толькі сфальсіфікаваць звесткі аб сваім «знатным» паходжанні, таму ў 1815 г. «высакародны» («urodzony») жыхар Мінскага павета Даніэль Гіндэнбург (Hindenburg) пачаў «адшукванне» свайго шляхецтва, падаўшы ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход (відаць, не без паслуг канцылярскіх «махляроў» самога сходу) дакументы на зацвярджэнне яго сям'і ў дваранскай годнасці [42, арк. 16–19]. У шляхецкім вывадзе ён называе ў якасці родапачынальніка Гіндэнбургаў свайго бацьку Паўла, нібыта шляхціца герба «Брохвіч I», які ў сярэдзіне 1780-х гг. пераехаў з Германіі ў Хэлмскае ваяводства, а сам Даніэль у той жа час аддзяліўся ад бацькі і прыбыў на сталае месцажыхарства ў Мінскае ваяводства. Свае довады ён падмацаваў пісьмовым пасведчаннем чыноўнікаў і шляхты Мінскай губерні аб яго шляхецкім паходжанні. У выніку дваранскі дэпутацкі сход сваёй пастановай ад 7 снежня 1815 г. унёс Гіндэнбургаў як іншаземны род гер-



*Мал. 2.* **Герб дваранскага роду Гіндэнбургаў «Брохвіч I», 1815 г.**

ба «Брохвіч I» (герб меў наступнае апісанне: «Чырвоны алень у белым полі, які ўстаў на дыбкі, нібы для хуткага бегу, на яго шыі карона, над шлемам паўлінава пер’е» [42, арк. 16–16 адв.]) у чацвёртую частку дваранскай радаводнай кнігі Мінскай губерні [57, арк. 549–550 адв].

Менавіта з гэтага моманту прозвішча набывае і сталае ўжыванне ў форме «Гіндэнбург» («Hindenburg»). Зрэшты, пры чарговым перапісу Гіндэнбургаў зафіксавалі ў рэвізскай сказцы ад 16 ліпеня 1816 г. як дваран Мінскага павета, якія ва ўласным маёнтку Стадолішча валодаюць 14 душамі прыгонных [64, арк. 1337].

Стаўшы «тыповым памешчыкам» і будучы ўжо не маладым чалавекам, Даніэль Гіндэнбург адышоў ад звыклых яму заняткаў млынавага майстра. Але да канца жыцця яго лёс быў цесна звязаны з Мінскай лютэранскай супольнасцю, у дзейнасці якой ён іграў не апошнюю ролю. Пастар Мінскай евангелічна-лютэранскай царквы Самуэль Карштадт незадоўга да сваёй смерці ў 1831 г. даручыў Гіндэнбургу быць выканаўцам яго духоўнага тастамента, паводле якога пастарскае жалаванне завяшчалася на карысць кірхі [44]. Відаць, праз некалькі год, дзесьці да сярэдзіны 1830-х гг., у сваім загарадным маёнтку Стадолішча памёр і сам Даніэль Гіндэнбург. Пасля яго засталіся другая жонка Крысціна, якая была значна маладзейшая за яго [58; 64], і дзеці ад першага шлюбу (першая жонка Даратэя Даніэлеўна памерла дзесьці паміж 1806 і 1816 гг. [71, с. 372]): малодшыя сыны Вільгельм (1799 г. нар.) і Самуэль (1806 г. нар.), пра якіх мы яшчэ скажам ніжэй; дачкі Караліна (каля 1802 г. нар.), жонка кандыдата філасофіі і ўладальніка аптэкі ў Мінску Карла Фрыдрыхавіча (Іванавіча) Кухэнбэкера (Kuchenbeker) [31, арк. 54–55], і Амалія (каля 1805 г. нар.), жонка доктара медыцыны і мазырскага павятовага лекара Вільгельма Хрыстафоравіча Крумзіга (Krumsieg) [83]. Старэйшыя сыны Даніэля Гіндэнбурга Самуэль-Багуміл-Лаўрэнцій (1791 г. нар.) і Іяган-Фердынанд (1797 г. нар.), пра якіх мы ўжо згадвалі як хрышчаных у касцёле, хутчэй за ўсё, памерлі ў дзіцячым узросце.

Далей мы не будзем засяроджваць увагу на падрабязных біяграфіях усіх прадстаўнікоў роду Гіндэнбургаў, якім раней мы ўжо прысвячалі пэўныя публікацыі [69; 71; 72]. Абмяжуемся толькі невялікімі нарысамі і даведкамі, каб можна было пабачыць прафесійны і геаграфічны размах іх служэння і ацаніць уклад у развіццё нашых зямель.

## «Выдатны акушэр і вялікай дабрыні чалавек»: Вільгельм Данілавіч[19] Гіндэнбург (1799–1877)

Вільгельм-Павел, адзін з малодшых сыноў Даніэля Паўлавіча і Даратэі Даніэлеўны, народжанай Флік, Гіндэнбургаў, нарадзіўся 17 ліпеня 1799 г. у горадзе Мінску і быў хрышчаны 24 ліпеня лютэранскім пастарам Самуэлем Карштадтам [5; 57, арк. 549 адв.; 60, арк. 14]. Пасля сканчэння ў 1821 г. медыцынскага факультэта Імператарскага Віленскага ўніверсітэта са ступенню лекара 1-га аддзялення займаўся на працягу чатырох гадоў вольнай урачэбнай практыкай у Мінскай губерні [82, арк. 7 адв. –8]. Прыняўшы рашэнне паступіць на дзяржаўную службу, ён у 1825 г. атрымаў прызначэнне на пасаду павятовага лекара ў горад Ельню Смаленскай губерні [48], дзе лёс звязаў яго з маладым Міхаілам Іванавічам Глінкам, будучым вядомым кампазітарам, аўтарам опер «Жыццё за цара» і «Руслан і Людміла». Вобраз спагадлівага лекара Гіндэнбурга запомніўся яму на ўсё жыццё, і незадоўга да смерці Глінка ў сваіх мемуарах ахарактарызаваў яго як «добрага нашага павятовага доктара» [19, с. 69]. Паралельна (з 1828 г.) Гіндэнбург дармова працаваў настаўнікам гігіены і лекарам пры Мінскай парафіяльнай рымска-каталіцкай духоўнай семінарыі [82, арк. 9 адв. – 10].

У лютым 1830 г. Вільгельму Гіндэнбургу «паводле выслугі гадоў» надаюць званне штаб-лекара [75, арк. 16 адв. –17]. У канцы восені 1832 г. ён паспяхова здае ў Імператарскім Маскоўскім універсітэце экзамен на званне акушэра ўрачэбнай управы [89], а праз два месяцы міністр унутраных спраў прызначае яго акушэрам у Мінскую ўрачэбную ўправу – галоўную медыка-адміністрацыйную ўстанову Мінскай губерні [82, арк. 7 адв. –8]. Акрамя акушэра, у нешматлікі штат урачэбнай управы ўваходзілі яшчэ два медыцынскія чыноўнікі – інспектар («фізік») і хірург («аператар»). Пасаду інспектара ўправы тады займаў доктар Данііл Восіпавіч Спасовіч, які карыстаўся «павагай і любоўю ўсяго мінская краю» [92, с. 144]. На працягу шмат гадоў акушэр Гіндэнбург з ім плячо ў плячо служыў сваім суайчыннікам [20, с. 332–333].

У жніўні 1834 г. Вільгельм Гіндэнбург у тым жа Маскоўскім універсітэце трымае чарговы экзамен, па выніках якога яго прызнаюць

[19] Адносна імені ў крыніцах назіраецца match рознапісанне: у якасці ўласнага імя захоўваецца форма «Даніэль», але ў якасці імя па бацьку («Данілавіч») заўсёды выкарыстоўваецца форма «Данііл».

годным звання інспектара ўрачэбнай управы [90]. З гэтага ж часу пачынаецца яго дзейнасць як члена Мінскага губернскага папячыцельнага аб турмах камітэта [43, арк. 49]. На працягу чатырох дзесяцігоддзяў, да сваёй смерці, Гіндэнбург заставаўся ледзь не самым перакананым і адданым удзельнікам гэтай турэмна-дабрачыннай арганізацыі, крэда якой заключалася ва ўсебаковай духоўнай і фізічнай дапамозе «існым у кайданах» [72, с. 96]. У канкрэтна-практычным сэнсе гэта азначала, акрамя іншага, тое, што галоўны пенітэнцыярый губерні – Мінскі турэмны замак, які дзесяцігоддзем раней шатландскі місіянер-падарожнік Роберт Пінкертон ахарактарызаваў як перапоўнены «вялізны драўляны барак» у антысанітарных умовах [97, p. 88–89], – на доўгія гады трапляў пад пільны прыцэл апекі спагадлівага лекара Гіндэнбурга.

Вільгельм Данілавіч Гіндэнбург болей за ўсіх праславіў свой род. Сучаснікі, якія добра ведалі яго асабіста, былі шчодрыя на самыя ўзнёслыя эпітэты ў яго адрас: «Хіба гэта не метэор, не прамяністая зорка на гарызонце чалавецтва?» [63, с. 92]. Гіндэнбург быў адным з самых перадавых лекараў-філантропаў Расійскай імперыі і адным з самых яркіх прадстаўнікоў мясцовай практычнай медыцыны, прайшоўшы паўвекавы шлях ад вольнапрактыкуючага доктара да прэзідэнта Таварыства мінскіх лекараў. Больш за трэць стагоддзя ён праслужыў акушэрам у Мінскай урачэбнай управе (з 1833 да 1867 г.) і ўрачэбным аддзяленні Мінскага губернскага праўлення (з 1867 да 1870 г.) [55, с. 24, 43, 112; 77], набыўшы сярод мінчан рэпутацыю «выдатнага акушэра і вялікай дабрыні чалавека» [96, s. 49], а затым да самай смерці (з 1870 да 1877 г.) добраахвотна і дармова нёс служэнне штатнага лекара бальніцы пры Мінскім турэмным замку [5; 54, с. 15, 35, 37–38; 56, с. 26]. Да сваіх хворых Гіндэнбург адносіўся з бацькоўскай апекай і стараўся прымяняць самыя эфектыўныя меры па іх ачуньванні (напрыклад, паспяхова выкарыстоўваў рвотны камень пры лячэнні запалення лёгкіх [46, арк. 151 адв.]), а апошнія тыдні свайго жыцця прысвяціў адчайнай барацьбе з эпідэміяй тыфоіднай гарачкі, якая ўспыхнула ў турэмным замку [5, с. 67; 15; 27, арк. 1–1 адв.]. У 1871 г. яму надаюць ганаровае членства ў Імператарскім Віленскім медыцынскім таварыстве, а ў лістападзе 1875 г. большасцю галасоў яго абіраюць прэзідэнтам Таварыства мінскіх лекараў [69, с. 77–78]. Асоба доктара Гіндэнбурга была настолькі папулярнай сярод жыхароў Мінска, што яны заснавалі пры губернскай гімназіі стыпендыю ў яго гонар [95, s. 171]. Сучаснікі

фіксавалі кранальныя гісторыі пра яго самаахвярную дапамогу хворым і няшчасным людзям [3, с. 382; 4, с. 107–108; 63, с. 90–91].



*Мал. 3.* **Доктар Вільгельм Данілавіч Гіндэнбург (1799–1877). Фотаздымак прыблізна 1871 г.**



*Мал. 4.* **Будынак Мінскай евангелічна-лютэранскай царквы. Паштоўка пачатку XX ст.**

Шматгадовая дзейнасць Гіндэнбурга, які даслужыўся да чына стацкага саветніка (1865), была адзначана «манаршай ласкай» за барацьбу ў 1848 г. з эпідэміяй халерыў Мінску (1850) [76, арк. 5 адв. – 6], ордэнамі Св. Ганны 3-й ступені (1858), Св. Станіслава 2-й ступені (1863), Св. Уладзіміра 4-й ступені (1864), Св. Ганны 2-й ступені з імператарскай каронай (1871) і знакам узнагароды «За XL гадоў бездакорнай службы» (1867) [59; 71, с. 373].

Значную ролю Вільгельм Гіндэнбург іграў і ў канфесійным жыцці губернскай сталіцы. У 1844–1863 гг. ён быў членам царкоўнага савета Мінскай евангелічна-лютэранскай парафіі, пасля вялікага пажару 1835 г. прымаў арганізацыйны і фінансавы ўдзел у аднаўленні Мінскай кірхі[20], якая потым, паводле сведчання тагачаснага беларускага этнографа П. М. Шпілеўскага, з’яўлялася адной з прыгажэйшых пабудоў Мінска [92, с. 149].

Доктар Гіндэнбург таксама атрымаў вядомасць як памешчык і домаўладальнік. Бацькоўскі маёнтак Стадолішча ён перадаў у 1846 г. свайму малодшаму брату Самуэлю [30; 73, с. 39], а сам праз два гады набыў у Канстанціна і Яна Апалінарыевічаў Кялчэўскіх маёнтак Магазінак (Магазінкі) Мінскага павета [37]. Акрамя таго, у 1854 г. ён набыў у Леапольда Восіпавіча і Каміліі Іванаўны Эстэрэйхераў маёнтак Давідпаль (Зацішша) Мінскага павета [36]. З 1855 да 1864 г. арандаваў у Пінскага Багаяўленскага

[20] Гл. пра гэта больш падрабязна: [72, с. 97–101].

манастыра 24 моргі зямлі ва ўрочышчы Міхалянка Мінскага павета [29]. У Мінску Гіндэнбург у 1842 г. набыў у мяшчанкі Цемы Хаімаўны Паляковай зямлю па Юр'еўскай вуліцы (знаходзілася ў раёне сучаснай Кастрычніцкай плошчы, паралельна вуліцы Інтэрнацыянальнай), дзе праз 10 гадоў пабудаваў уласны каменны дом [71, с. 373], у якім пасяліўся і жыў да самай смерці. Паводле афіцыйных дадзеных за 1876 г., у маёнтках Магазінкі і Давідполь яму належалі 274 і 703 дзесяціны зямлі адпаведна [73, с. 39].

77-гадовы Гіндэнбург фактычна «згарэў» на службе. Руплівая і самаадданая праца лекара пры губернскай турме канчаткова знясіліла яго. У нямецкамоўнай метрычнай кнізе аб памерлых Мінскай кірхі мы знаходзім запіс аб смерці стацкага саветніка доктара Вільгельма-Паўла фон Гіндэнбурга, якая сталася 6 лютага 1877 г. у Мінску а 9-й гадзіне раніцы ў выніку запалення лёгкіх («Lungenentzündung») [52, арк. 14 адв. – 15, № 3]. «На працягу невялікага прамежку часу, – тлумачыць сучаснік, – высокапаважаны стары чатыры разы хварэў на запаленне лёгкіх – і чацвёрты раз увагнаў яго ў магілу» [63, с. 92].

11 лютага 1877 г. у абед Гіндэнбург быў пахаваны на Мінскіх лютэранскіх могілках [52, арк. 14 адв. –15, № 3]. «Я не памятаю ў Мінску пахавання больш урачыстага за пахаванне доктара Гіндэнбурга, – сведчыць генерал-маёр барон Васіль Аляксеевіч фон Роткірх, які, будучы начальнікам Мінскага жандарскага паліцэйскага ўпраўлення чыгункі, жыў у Гіндэнбургаў на кватэры. – Тысячныя масы народу, што суправаджалі пахавальны картэж, плакалі наўзрыд. Непрытворныя слёзы гэтых беднякоў, абадранцаў, жабракоў красамоўна, без слоў, гаварылі, чым быў Гіндэнбург для мінскага народанасельніцтва» [63, с. 89]. Другі сведка пахавання, Адам Ягоравіч Багдановіч, бацька вядомага беларускага паэта, падае больш дакладную статыстыку: «Колькасць тых, хто суправаджаў труну, была велізарнай – з дзесятак тысяч чалавек…» [3, с. 382]. Маладая яўрэйская дзяўчына Соф'я Яфімаўна Лур'е, дачка ўплывовага мінскага банкіра, «пад свежым уражаннем пахавальнага маршу» напіша ў сталіцу ліст свайму знаёмаму – пісьменніку Ф. М. Дастаеўскаму, паведаміўшы пра Гіндэнбурга, між іншым, наступнае: «Ён быў доктар і акушэр; яго імя пяройдзе тут у патомства, аб ім ужо склаліся легенды, увесь просты народ зваў яго бацькам, любіў, абажаў і толькі з яго смерцю зразумеў, што ён згубіў у гэтым чалавеку. <…> Затое хавалі яго як святога. Усе беднякі зачынілі крамы і беглі за трунай. У яўрэяў ёсць хлопчыкі, якія

пры пахаваннях распяваюць псалмы, але забараняецца праводзіць іншаверца гэтымі псалмамі. Тут перад труной, падчас працэсіі, хадзілі хлопчыкі і гучна распявалі гэтыя псалмы. Ва ўсіх сінагогах маліліся за яго душу, таксама званы ўсіх цэркваў званілі ўвесь час працэсіі. <…> Над яго магілай трымалі слова пастар і яўрэйскі рабін, і абодва плакалі, а ён сабе ляжаў у старэнькім, сцёртым віцмундзіры, старой хусткай была абвязана яго галава, гэтая мілая галава, і здавалася, ён спаў, такі свежы быў колер яго твару…» [14, с. 97–98].

Ф. М. Дастаеўскі настолькі быў уражаны светлым вобразам «агульнага чалавека» Гіндэнбурга, які з’яднаў над сваёй труной прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей і канфесій губернскага Мінска, што прысвяціў яму цэлыя два раздзелы трэцяй главы «Дзённіка пісьменніка» за сакавік 1877 г. [14, с. 96–101]. Пахаванне доктара Гіндэнбурга ён успрыняў як феномен межэтнічнага катарсіса. «Гэты горад М[інск], – пісаў Дастаеўскі, – гэта вялікі губернскі горад у заходнім краі, і ў гэтым горадзе мноства яўрэяў, ёсць немцы, рускія канешне, палякі, літоўцы, – і ўсе якраз, усе гэтыя народнасці прызналі праведнага старэнькага кожная за свайго. Сам жа ён быў пратэстант, і менавіта немец, цалкам немец… <…> Пяцьдзесят восем гадоў служэння чалавецтву ў гэтым горадзе, пяцьдзесят восем гадоў нястомнай любві з’ядналі ўсіх хоць раз над труной яго ў агульным захапленні і ў агульных слязах. <…> Штó ў тым, што, парасходзіўшыся, кожны прымецца за старыя забабоны: капля камень точыць, а вось гэтыя якраз “агульныя чалавекі” перамагаюць свет, з’ядноўваючы яго; забабоны будуць бляднець з кожным адзінкавым выпадкам і нарэшце зусім знікнуць» [14, с. 98, 100–101]. Барон В. А. фон Роткірх, які добра ведаў Гіндэнбурга асабіста, сведчыў пра яго не менш узнёсла: «Гэта быў сумленнейшы і найдабрэйшы чалавек, аптыміст, ідэаліст; ён нават не падазраваў у чалавеку нічога дурнога, але бачыў у ім адну беззаганнасць, чыстае стварэнне, што выйшла з рук Божых для шчасця сабе падобных» [63, с. 92].

У фамільным некропалі Гіндэнбургаў на Мінскіх лютэранскіх могілках Вільгельм Данілавіч быў пахаваны пятнаццатым [5, с. 67]. Ад першага шлюбу з Юліяй Граф (памерла паміж 1833 і 1844 гг.) ён меў сыноў Фрыдрыха-Крысціяна (каля 1826 г. нар.), Адольфа-Вільгельма (1831 г. нар.), Эдуарда-Карла (1832 г. нар.) і Леапольда-Даніэля (1833 г. нар.), але першыя тры з іх памерлі ў вельмі маладым узросце (паміж 1833 і 1846 гг.), а чацвёрты сын Леапольд, аператар-кансультант (з 1881 да 1896 гг.) і галоўны доктар (1897) Стара-Екацярынінскай

бальніцы ў Маскве [78; 88], «па сваіх душэўных якасцях – другі доктар Гааз» [66, с. XIII], роўна на 20 гадоў перажыў бацьку, раптоўна (пры абыходзе хворых) сканаўшы 9 лютага 1897 г. у званні доктара медыцыны і з «генеральскім» чынам правадзейнага стацкага саветніка [25; 62, с. 319; 87].

Пасля смерці Вільгельма Гіндэнбурга засталіся яго другая жонка Разалія Аляксандраўна, народжаная Лінэбург (1815–1900), і трое дзяцей ад гэтага шлюбу: сын Вільгельм-Генрых (1851–1907), судовы следчы горада Мінска (з 1878 да 1882 г.), таварыш пракурора Мінскага акруговага суда (з 1882 да 1887 г.), чыноўнік па судовай частцы пры Мінскім (з 1887 да 1896 г.) і Віленскім (з 1896 да 1907 г.) губернскіх акцызных упраўленнях, стацкі саветнік (1890) [32; 85], «багабойны і лепшы лютэранін», які за два тыдні да смерці па ўласнай унутранай перакананасці далучыўся да праваслаўя з імем «Васілій» [18, с. 477–478; 53, с. 293; 61, с. 284, 289–290]; дачкі Алена-Эмілія (1845 г. нар.) і Юлія-Эліза (1856 г. нар.), якая была замужам за аўстрыйскім падданым (славакам) і выкладчыкам старажытных моў Слуцкай мужчынскай гімназіі Іванам Пятровічам Далякам [39]. Вільгельм і Разалія Гіндэнбургі мелі яшчэ двух дачок – Ганну (каля 1844 г. нар.) і Марыю (1853 г. нар.), але яны памерлі ў дзіцячым узросце [71, с. 374–375].



*Мал. 5.* **Доктар Леапольд Вільгельмавіч Гіндэнбург (1833–1897). Фота канца XIX ст.**

## Канцылярскі і фінансавы чыноўнік: Самуэль Данілавіч Гіндэнбург (1806–1873)

Самуэль быў самым малодшым з усіх вядомых нам дзяцей Даніэля Паўлавіча і Даратэі Даніэлеўны Гіндэнбургаў, нарадзіўся 10 снежня 1806 г. у горадзе Мінску і праз два дні хрышчаны там лютэранскім пастарам [13, арк. 50 адв. –51, № 58; 60, арк. 16]. Ён быў цесна звязаны з асяроддзем канцылярскіх чыноўнікаў Мінска і адыграў вырашальную ролю ў юрыдычным замацаванні роду Гіндэнбургаў у самых вярхах сацыяльнай лесвіцы. У адрозненне ад свайго старэйшага брата Вільгельма, ён не атрымаў вышэйшай адукацыі, скончыўшы толькі Мінскую губернскую гімназію. Патрэбныя веды ён здабываў ужо, відаць,

у Канцылярыі мінскага цывільнага губернатара, куды ўладкаваўся канцылярыстам у 1827 г.

Бюракратычныя бар'еры мікалаеўскіх часоў пры пацвярджэнні шляхецтва ў мясцовых дваранскіх дэпутацкіх сходах і Дэпартаменце Герольдыі Сената аказаліся толькі на руку квітнеючым і знаходлівым немцам Гіндэнбургам, хоць і рамеснікам паводле сацыяльнага паходжання, бо менавіта чарговая працэдура шляхецкіх доказаў дазволіла ім трапіць у найвышэйшую катэгорыю дваранскіх родаў. Самуэль Гіндэнбург, які працягнуў дваранскую справу сваёй фаміліі, у 1830 г. быў вымушаны зрабіць дадатковы вывад шляхецтва, у якім змянілася не толькі генеалагічная схема роду [6], але і самі доказы [42, арк. 25–32]. На гэты раз радавая легенда Гіндэнбургаў дасягае свайго апагея, як і махлярскае мастацтва канцылярскіх чыноўнікаў дваранскага дэпутацкага сходу.

З прадстаўленых у доказ шляхецтва дакументаў, у пераважнай большасці сфальсіфікаваных, вынікала, што родапачынальнікам Гіндэнбургаў (цяпер ужо «Пасторыусаў-дэ-Гіндэнбургаў») з'яўляецца вядомы польскі гісторык, тэолаг, лекар і педагог каралеўскі сакратар Іаахім Пасторыус-дэ-Гіртэнбэрг (1611–1681), які ў 1662 г. атрымаў ад караля Яна-Казіміра індыгінат (прывілей на шляхецтва). Пры гэтым Павел Гіндэнбург (родапачынальнік Гіндэнбургаў у вывадзе ад 1815 г.) выводзіўся яго прамым нашчадкам у чацвёртым пакаленні і нібыта валодаў спадчынным маёнткам Калдова, ці Гронава, у Члухоўскім павеце Паморскага ваяводства і меў чын оберштэрлейтэнанта літоўскіх войскаў, а сын Паўла Даніэль (млынавы майстар) называўся адстаўным маёрам тых жа войскаў і нават сваяком вядомага генерала Леапольда Рэйбніца, да якога пасля падзелаў Рэчы Паспалітай ён прыбыў з Паморскага ваяводства ў маёнтак Храноў Навагрудскага павета, адкуль ужо потым пераехаў у Мінскі павет[21] [12; 60]. У якасці доказаў Самуэлем Гіндэнбургам таксама былі пададзены сфальсіфікаваныя (шляхам інтэрпаляцыі) метрыкі аб хрышчэнні яго і брата Вільгельма, дзе іх бацька Даніэль Гіндэнбург фігуруе не проста як немец-лютэранін, але як «высакародны дваранін Мінскага павета» з прозвішчам «Пасторыус-дэ-Гіндэнбург» [60, арк. 15, 16].

У выніку Мінскі дваранскі дэпутацкі сход сваёй пастановай ад 22 студзеня 1830 г. зноў прызнае Гіндэнбургаў у дваранстве, праўда, ужо

[21] Больш падрабязны аналіз вывадовай дакументацыі Гіндэнбургаў з пералікам пададзеных імі дакументаў гл.: [71, с. 378–379].

як «Пасторыусаў-дэ-Гіндэнбургаў», з унясеннем іх спачатку ў першую, а потым у шостую частку дваранскай радаводнай кнігі Мінскай губерні [12, арк. 9–12; 42, арк. 27–30 адв., 34]. Усе сфальсіфікаваныя доказы для Сената прагучалі пераканаўча, і ўжо 21 мая 1831 г. ён зацвердзіў род Гіндэнбургаў у дваранстве з унясеннем яго менавіта ў шостую (самую прэстыжную) частку дваранскай радаводнай кнігі [42, арк. 34–35].

Зрэшты, у самім фальсіфікацыйным механізме шляхецкага вываду Гіндэнбургаў за 1830 г. было мала арыгінальнага. Самуэль Гіндэнбург, а дакладней канцылярскія «махляры», якім ён, відаць, плаціў грошы, прымяняў тыповыя для таго часу схемы фальсіфікацыі, у прыватнасці, такую, калі фальсіфікуюцца не столькі дакументы, колькі самі сваяцкія сувязі з вядомымі дзеячамі польскай гісторыі XVII ст. дзякуючы сугучнасці прозвішчаў («Гіндэнбург» – «Гіртэнбэрг») [70, с. 129–130].

У Канцылярыі мінскага цывільнага губернатара Самуэль Гіндэнбург працаваў да 1832 г., пасля чаго на тры гады быў абраны засядальнікам Мінскага ніжняга земскага суда [41], служыў канцылярыстам Мінскай казённай палаты (1836), барысаўскім павятовым скарбнікам (з 1836 да 1841 г.) [79; 80], балцкім (1841) і камянецкім (з 1841 да 1842 г.) земскім спраўнікам, вушыцкім гараднічым (з 1842 да 1845 г.) у Падольскай губерні, акцызным наглядчыкам у Ігуменскім павеце (з 1854 да 1862 г.), даслужыўся да чына калежскага асэсара (1858) і ў 1863 г. выйшаў у адстаўку «з прычыны хваробы». Пазней, праўда, на непрацяглы час, ён быў зноў прыняты ў Канцылярыю мінскага цывільнага губернатара ў якасці канцылярскага чыноўніка [84].

Памёр Самуэль Данілавіч Гіндэнбург 23 снежня 1873 г. ад знясілення арганізму («Auszehrung») і быў пахаваны праз чатыры дні на Мінскіх лютэранскіх могілках [13, арк. 50 адв. –51, № 58]. Ён знаходзіўся ў шлюбе з каталічкай (паводле больш позніх звестак – лютэранкай) Эміліяй Янаўнай Рагальскай (каля 1816 г. нар.), дваранкай, і меў ад яе двух дзяцей – сына Вільгельма-Іосіфа (1832 г. нар.), канцылярскага чыноўніка Мінскай (з 1855 да 1857 г.) і Кіеўскай (з 1857 да 1868 г.) палат дзяржаўных маёмасцяў, выканаўцу работ па складанні люстрацыйных актаў у Кіеўскай губерні (з 1868 да 1892 г.), калежскага саветніка (1873) [81], і дачку Сабіну (1838 г. нар.), жонку Васілія Іванавіча Даніэля.

Усяго фамільны некропаль Гіндэнбургаў на Мінскіх лютэранскіх могілках к пачатку XX ст. павінен быў налічваць некалькі дзясяткаў пахаванняў, але да нашага часу ён не дайшоў, бо ў канцы 1970-х гг.

гэтыя старыя і запушчаныя «нямецкія» могілкі ў Мінску зраўнавалі з зямлёю, а на іх месцы (па вуліцы Карла Лібкнехта – былой Нямецкай, ці Мала-Лютэранскай) разбілі сквер, які адносна нядаўна атрымаў назву «Лютэранскі».

У заключэнне трэба падкрэсліць, што вывучэнне генезісу і генеалогіі дваранскіх родаў іншаземнага паходжання на беларускіх землях, а таксама службовай дзейнасці іх асобных прадстаўнікоў істотна пашырае і канкрэтызуе нашы ўяўленні аб этнасацыяльнай дынаміцы ў гэтым рэгіёне ў часы Расійскай імперыі. Род немцаў Гіндэнбургаў з'яўляецца яскравым прыкладам не толькі сацыяльнай эскалацыі некаторых катэгорый іншаземцаў, але і фарміравання тут устойлівых груп служылага дваранства.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Аўчыннікава, Р. І.* Магнус Гедэман – назіральнік за надвор'ем Палесся / Р. І. Аўчыннікава. – Мінск: Выд. В. Хурсік, 2018. – 44 с.

2. *Бегун, Р. А.* Планы Минска кон. XVIII – первой трети XIX вв. как источники по социальной топографии города / Р. А. Бегун // Genesis: исторические исследования. – 2020. – № 3. – С. 39–59.

3. *Богданович, А. Е.* Я всю жизнь стремился к свету: в 2 кн. / А. Е. Богданович. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2012. – Кн. 1: Мои воспоминания / сост. А. Ващенко. – 544 с.

4. *Букчин, С.* Откровения юных душ. Ф. М. Достоевский и его корреспонденты. Две повести в письмах и комментариях / С. Букчин. – [New York]: Franc-Tireur, [2017]. – 154 с.

5. Вильгельм Данилович Гинденбург: некролог // Навукова-даведачная бібліятэка Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. – № 182: «Минские губернские ведомости» за 1877 г. – № 6. – Часть неофициальная. – С. 66–67.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 319 (Мінскі дваранскі дэпутацкі сход). Воп. 1. Спр. 1162. – Генеалагічная табліца дваранскага роду Гіндэнбургаў герба «Брохвіч» ад 22.01.1830 (польск.). Арк. 2 адв.–2а. № 2.

7. Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 3: В / Дз. Матвейчык [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск: Беларусь, 2014. – 648 с.

8. Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 4: Г / Д. Ч. Матвейчык [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск: Беларусь, 2016. – 960 с.

9. Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 5: Д / Я. С. Глінскі [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск: Беларусь, 2018. – 848 с.

10. Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 6: Е, Ё, Ж / Я. С. Глінскі [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск: Беларусь, 2020. – 544 с.

11. Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 7: З, І / Я. С. Глінскі [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск: Беларусь, 2020. – 800 с.

12. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 162. – Дадатковая пастанова Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Пасторыушаў-дэ-Гіндэнбургаў герба «Брохвіч 1-шы» ад 22.01.1830 (польск.). Арк. 9–12.

13. Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі. – Ф. 292 (Дакументы царкоўных устаноў за межамі Латвіі). Воп. 1. Спр. 43. – Метрычныя кнігі аб народжаных, пабраных шлюбам і памерлых Мінскай евангелічна-лютэранскай царквы за 1868–1874 гг. (ням.). 75 арк.

14. *Достоевский, Ф. М.* Собрание сочинений: в 9 т. / Ф. М. Достоевский. – М.: Астрель; АСТ, 2004. – Т. 9, кн. 2: Дневник писателя. – 528 с.

15. *Дрозд, Д.* Доктор Гинденбург и эпидемия тифа в Минском тюремном замке [Электронный ресурс] / Д. Дрозд. – Режим доступа: https://bydc.info/news/311-epidemiya-tifa-v-minskom-tyuremnom-zamke. – Дата доступа: 20.04.2021.

16. *Елинская, М. М.* Белорусские ветви в генеалогии дворянских родов западноевропейского происхождения / М. М. Елинская // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навуковы зборнік. Вып. 4 / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 246–257.

17. *Елинская, М. М.* Источники о дворянских родах западноевропейского происхождения в белорусских губерниях конца XVIII – начала XX вв.: дис. … канд. ист. наук: 07.00.09 / М. М. Елинская. – Минск, 2005. – 152 л.

18. Епархиальная хроника // Минские епархиальные ведомости. – 1907. – № 15. – Часть неофициальная. – С. 475–478.

19. Записки М. И. Глинки. – М.: Гареева, 2004. – 448 с.

20. *Зеленков, В.* Род Спасовичей в Минске / В. Зеленков // Асоба і час: Беларускі біяграфічны альманах. Вып. 5 / уклад. А. Фядута; пад навук. рэд. Т. Я. Аўтуховіч, З. В. Шыбекі. – Мінск: Лімарыус, 2013. – С. 328–344.

21. Иностранные подданные в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / сост. И. Л. Вернер; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск: Типография Макарова и К, 2012. – 528 с.

22. *Іванова, Л. С.* Лютэранская кірха ў Мінску ў XIX – пачатку XX ст. / Л. С. Іванова // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права): матэрыялы Міжнар. навук-практ. канф. (Мінск, 4–5 вер. 2009 г.). – Мінск: Беларус. навука, 2010. – С. 90–94.

23. *Князева, Е. Е.* Лютеранские церкви и приходы в Белоруссии, Молдавии, Закавказье и Средней Азии XVIII – XX вв. Исторический справочник. Ч. III / Е. Е. Князева. – СПб.: Литера, 2006. – 200 с.

24. *Курило, О. В.* Лютеране в России. XVI–XX вв. / О. В. Курило. – [М.]: Фонд «Лютеранское наследие», 2002. – 400 с.

25. *Михайлов, Н.* Л. В. Гинденбург. Некролог / Н. Михайлов // Врачебные записки. – 1897. – Т. IV. – С. 89–91.

26. НГАБ. – Ф. 24 (Мінская гарадская дума). Воп. 1. Спр. 2. – Журналы пасяджэнняў Мінскай агульнай і шасцігласнай думы за 1796 г. 129 арк.

27. НГАБ. – Ф. 29 (Мінскі губернскі папячыцельны аб турмах камітэт). Воп. 1. Спр. 383. – Справа аб з'яўленні тыфознай гарачкі ў Мінскім турэмным замку. 04.01.1877–10.02.1878. 41 арк.

28. НГАБ. – Ф. 136 (Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя). Воп. 1. Спр. 6953. – Справа паводле прашэння паверанага Пінскага Багаяўленскага манастыра Л. Даневіча аб выдаче яму выпісаў з прыходна-расходных кніг аб унясенні жыхаром г. Мінска Д. Гінтэнберкам (Гінтэнбуркам) грошай за арэнду з 1795 да 1801 гг. манастырскай зямлі з цагельным заводам пры фальварку Пярэспа Мінскага павета. 03.11.1825–12.11.1825. 5 арк.

29. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30856. – Справа аб здачы ў арэнду двараніну Я. С. Александровічу ўчастка зямлі Пінскага Багаяўленскага манастыра ва ўрочышчы Міхалянка Мінского павета. 24.08.1864–21.12.1864. 13 арк.

30. НГАБ. – Ф. 142 (Мінскі губернскі камітэт для разгляду і складання інвентароў памешчыцкіх маёнткаў). Воп. 1. Спр. 812. – Інвентар маёнтка Стадолішча Мінского павета памешчыка Д. П. Гіндэнбурга. 17.01.1845–08.11.1847. 23 арк.

31. НГАБ. – Ф. 146 (Мінская палата грамадзянскага суда). Воп. 1. Спр. 34. – Крэпасная кніга (польск., рус.). 19.10.1832–22.12.1832. 130 арк.

32. НГАБ. – Ф. 147 (Мінская злучаная палата крымінальнага і грамадзянскага суда). Воп. 4. Спр. 33184. – Справа аб службе судовага следчага г. Мінска В. В. Гіндэнбурга. 13.03.1872–18.05.1882. 132 арк.

33. НГАБ. – Ф. 149 (Мінскі гарадавы магістрат). Воп. 3. Спр. 6. Журналы пасяджэнняў прысутнасці магістрата за 1796 г. 548 арк.

34. НГАБ. – Ф. 149. Воп. 3. Спр. 7а. – Справа паводле паведамлення мінскага гараднічага Р. С. Пастухоўскага аб забойстве служачай у немца Д. Гінтэрбурга дзеўкай Г. Р. Макарэвіч яе незаконнанароджанага дзіцяці. 05.03.1796–10.03.1796. 4 арк.

35. НГАБ. – Ф. 149. Воп. 6. Спр. 1. – Рэвізскія сказкі жыхароў г. Мінска за 1795–1800 гг. (польск.). 92 арк.

36. НГАБ. – Ф. 159 (Мінскі павятовы суд). Воп. 1. Спр. 3553. Справа аб уводзе ў валоданне маёнткам Давідполь калежскага саветніка В. Д. Гіндэнбурга. 06.04.1854–28.12.1856. 8 арк.

37. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 5131. – Справа аб уводзе ў валоданне маёнткам Магазінак надворнага саветніка В. Д. Гіндэнбурга. 20.07.1848–28.08.1849. 6 арк.

38. НГАБ. – Ф. 179 (Мінскі губернскі межавы апеляцыйны суд). Воп. 1. Спр. 72. – Рашэнне таксатарска-эксдывізарскага суда ў маёнтку Прылепы Мінскага павета памешчыка Т. Гарадзенскага ад 09.12.1810 (польск.). 122 арк.

39. НГАБ. – Ф. 299 (Мінскае губернскае праўленне). Воп. 2. Спр. 16102. – Справа аб адчужэнні нерухомай маёмасці ў маёнтку Давідполь (Зацішша) Сёмкава-Гарадзецкай воласці Мінскага павета, якія належыць аўстрыйскай падданай Ю.-Л. В. Даляк. 15.03.1915–20.04.1916. 51 арк.

40. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 7. Спр. 2. – Фармулярныя спісы чыноўнікаў судовых, паліцэйскіх і фінансавых установ Мінскай губерні. 28.06.1797–15.12.1797. 258 арк.

41. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 7. Спр. 999. – Справа аб прызначэнні на пасаду засядальніка Мінскага ніжняга земскага суда службоўца Канцылярыі мінскага цывільнага губернатара калежскага рэгістратара С. Д. Гіндэнбурга. 30.01.1832–03.02.1832. 5 арк.

42. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 706. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Гіндэнбургаў (польск., рус.). 16.03.1816–21.05.1909. 89 арк.

43. НГАБ. – Ф. 320 (Канцылярыя мінскага губернскага маршалка). Воп. 2. Спр. 54. – Справа аб дзейнасці Папячыцельнага турэмнага камітэта ў г. Мінску. 12.11.1832–20.06.1835. 85 арк.

44. НГАБ. – Ф. 333 (Мінская казённая палата). Воп. 3. Спр. 515. – Справа аб выдачы памешчыку Мінскага павета Д. П. Гіндэнбургу як выканаўцы духоўнага тастамента нябожчыка лютэранскага пастара С. Карштадта пастарскага жалавання, завешчанага на карысць Мінскай евангелічна-лютэранскай царквы. 29.03.1831–25.08.1833. 16 арк.

45. НГАБ. – Ф. 437 (Мінская часовая павятовая рэвізская камісія). Воп. 2. Спр. 2. – Рэвізскія сказкі шляхты, памешчыцкіх і духоўных сялян, свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў, іншаземцаў Мінскага павета за 1795–1796 гг. (польск., рус.,). 301 арк.

46. НГАБ. – Ф. 502 (Таварыства мінскіх лекараў). Воп. 1. Спр. 3. – Пратаколы пасяджэнняў Таварыства мінскіх лекараў. 11.10.1871–06.03.1881. 359 арк.

47. НГАБ. – Ф. 741 (Мінскі кафедральны Марыінскі касцёл). Воп. 1. Спр. 6. – Метрычныя кнігі аб народжаных, пабраных шлюбам і памерлых Мінскага кафедральнага касцёла (лац.). 07.06.1793–23.12.1801. 133 арк.

48. НГАБ. – Ф. 1297 (Канцылярыя генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага). Воп. 1. Спр. 950. – Справа аб прызначэнні на пасаду павятовага лекара ў г. Ельню Смаленскай губерні вольнапрактыкуючага лекара В. Гіндэнбурга. 08.09.1825–12.04.1826. 10 арк.

49. НГАБ. – Ф. 1547 (Каралішчавіцкі Марыінскі касцёл). Воп. 1. Спр. 36. – Метрычныя кнігі аб народжаных Каралішчавіцкага касцёла. 18.10.1784–31.12.1824; выпісы з метрычных кніг уніяцкіх цэркваў Мінскага і Ігуменскага паветаў аб хрышчэнні парафіян Каралішчавіцкага касцёла (лац.). 18.08.1760–11.06.1827. 174 арк.

50. НГАБ. – Ф. 1952 (Евангелічна-лютэранскія цэрквы Беларусі). Воп. 1. Спр. 6. – Перапіска Савета Мінскай евангелічна лютэранскай царквы з Мінскім губернскім праўленнем і мінскім па следчых справах приставам

аб прыналежнасці Савету зямельнага ўчастка пад лютэранскімі могілкамі ў г. Мінску; даравальны акт і купчыя крэпасці на гэты ўчастак (ням., польск., рус.). 25.04.1799–07.09.1844. 21 арк.

51. НГАБ. – Ф. 1952. Воп. 1. Спр. 7. – Кніга прыходу грошай ад членаў Мінскай евангелічна-лютэранскай супольнасці (ням.). 1800–1871 гг. 39 арк.

52. НГАБ. – Ф. 1952. Воп. 8. Спр. 3. – Метрычныя кнігі аб народжаных, пабраных шлюбам і памерлых Мінскай евангелічна-лютэранскай царквы за 1877 г. (ням.). 17 арк.

53. *Павский, Д., свящ.* Речь, сказанная при погребении Василия Вильгельмовича Гинденбурга / свящ. Д. Павский // Минские епархиальные ведомости. – 1907. – № 16. – Часть неофициальная. – С. 290–294.

54. Памятная книжка Минской губернии 1875 года. – Минск: Мин. губ. тип., 1875. – Ч. 1: Адрес-календарь должностных лиц в губернии по всем ведомствам. – 192 с.

55. Памятная книжка Минской губернии на 1870 год. – Минск: Тип. губ. правления, 1870. – 290 с.

56. Памятная книжка Минской губернии на 1871 год. – Минск: Тип. губ. правления, 1871. – 248 с.

57. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 62. – Пастанова Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Гіндэнбургаў герба «Брохвіч 1-шы» ад 07.12.1815 (польск.). Арк. 549–550 адв.

58. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 234. – Пасямейны спіс двараніна 1-га разраду Мінскага павета Д. П. дэ Гіндэнбурга за [1833 г.]. Арк. 16 адв.–17. – № 52.

59. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). – Ф. 1297 (Медыцынскі дэпартамент МУС). Воп. 253. Спр. 180. – Справа аб узнагароджанні былога акушэра ўрачэбнага аддзялення Мінскага губернскага праўлення стацкага саветніка штаб-лекара В. Д. Гіндэнбурга з нагоды 50-гадовага юбілею яго службы. 1871 г. 29 арк.

60. РДГА. – Ф. 1343 (III Дэпартамент Сената). Воп. 19. Спр. 1707. – Справа аб дваранстве роду Гіндэнбургаў (Мінская губерня). 84 арк.

61. Речь, произнесенная о. протоиереем А. Юрашкевичем при отпевании Василия Вильгельмовича Гинденбурга // Минские епархиальные ведомости. – 1907. – № 16. – Часть неофициальная. – С. 284–290.

62. *Розанов, В. Н.* Из воспоминаний / В. Н. Розанов // Московская Екатерининская городская больница – родоначальница городской и общественной медицины. 1776–1926: Юбилейный сборник. – М.: Изд-во Мосздравотдела, 1929. – С. 318–322.

63. *[Роткирх В.А., фон].* Памяти доктора Гинденбурга / [В. А. фон Роткирх] // Воспоминания Теобальда. – Вильна: Тип. М. Р. Ромма, 1890. – Ч. 2: Виленские воспоминания. – Гл. X. – С. 88–92.

64. Рэвізская сказка двараніна Мінскага павета Д. П. Гіндэнбурга ад 16.07.1816 // НГАБ. – Фонд 333. – Воп. 9. – Спр. 107. – Арк. 1337.

65. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 196. – Рэвізская сказка дзедзічнага ўладальніка фальварка Вільгельмаўка Мінскага павета Д. П. Гіндэнбурга ад 15.12.1811. Арк. 265.

66. *Рябинкин, В. Н.* Роль больницы имени проф. Бабухина в истории Московской городской медицины и научной мысли / В. Н. Рябинкин // Московская Екатерининская городская больница – родоначальница городской и общественной медицины. 1776–1926: Юбилейный сборник. – М.: Изд-во Мосздравотдела, 1929. – С. V–XVI.

67. *Селицкий, А. И.* Польская шляхта в социально-правовой системе Российской империи / А. И. Селицкий // Поляки в России: XVII–XX вв.: материалы Междунар. науч. конф. (Краснодар, 10–11 июля 2002 г.) / науч. ред. и сост. А. И. Селицкий. – Краснодар: Кубанькино, 2003. – С. 105–128.

68. *Снапковский, Ю. Н.* Бароны Меллер-Закомельские герба собственного: опыт поколенной росписи / Ю. Н. Снапковский // Архіварыус: зб. навук. паведамлен. і арт. – Мінск: НГАБ, 2013. – Вып. 11. – С. 160–192.

69. *Снапковский, Ю. Н.* Штаб-лекарь и акушер Вильгельм Данилович Гинденбург / Ю. Н. Снапковский // Здравоохранение. – 2014. – № 1. – С. 72–80.

70. *Снапкоўскі, Ю.* Аб фальсіфікацыі шляхецкіх вывадаў іншаземцаў у XIX стагоддзі (на прыкладзе роду Гіндэнбургаў) / Ю. Снапкоўскі // Архівы і справаводства. – 2016. – № 1. – С. 123–131.

71. *Снапкоўскі, Ю.* ГІНДЭНБУРГІ, ПАСТОРЫУСЫ дэ ГІНДЭНБУРГІ (HINDENBURG, PASTORYUS de HINDENBURG) герба «БРОХВІЧ I» / Ю. Снапкоўскі // Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 4: Г / Д. Ч. Матвейчык [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск: Беларусь, 2016. – С. 372–379.

72. *Снапкоўскі, Ю.* Доктар Гіндэнбург і лёс евангелічна-лютэранскай супольнасці губернскага Мінска ў XIX ст. / Ю. Снапкоўскі // Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць (да 600-годдзя Евангельскай Царквы ў Беларусі): зб матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 7 снеж. 2013 г.) / уклад.: А. І. Бокун, А. У. Унучак, Ю. А. Бачышча; рэдкал.: П. І. Асененка і інш. – Мінск: Пазітыў-цэнтр, 2014. – С. 87–110.

73. Список землевладельцев Минской губернии за 1876 год. – Минск: Тип. губ. правления, 1877. – 214 с.

74. *Урублеўскі, В. В.* Род галандскіх дваран Гартынгаў на Беларусі / В. В. Урублеўскі // Архіварыус: зб. навук. паведамленняў і арт. – Мінск: БелНДІДАС, 2009. – Вып. 7. – С. 258–266.

75. НГАБ. – Ф. 134. Воп. 1. Спр. 160. – Фармулярны спіс аб службе акушэра Мінскай урачэбнай управы калежскага саветніка штаб-лекара В. Д. Гіндэнбурга за 1855 г. Арк. 1, 15 адв.–19.

76. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 3. Спр. 2044. – Фармулярны спіс аб службе акушэра Мінскай урачэбнай управы калежскага саветніка В. Д. Гіндэнбурга ад 22.06.1862 Арк. 3–8.

77. РДГА. – Ф. 1297. Воп. 253. Спр. 180. – Фармулярны спіс аб службе акушэра ўрачэбнага аддзялення Мінскага губернскага праўлення стацкага саветніка штаб-лекара В. Д. Гіндэнбурга за 1869 г. Арк. 14–21.

78. Цэнтральны дзяржаўны архіў горада Масквы (далей – ЦДА Масквы). – Аддзел захоўвання дакументаў да 1917 г. (далей – АЗД да 1917 г.). – Ф. 179 (Маскоўскія гарадскія дума і ўправа). Воп. 50. Спр. 67. – Фармулярны спіс аб службе аператара-кансультанта і спраўляючага пасаду старшага лекара Стара-Кацярынінскага аддзялення бальніцы для чорнарабочых ў Маскве правадзейнага стацкага саветніка Л. В. Гіндэнбурга ад 31.10.1887. Арк. 21–28.

79. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 7. Спр. 86. – Фармулярны спіс аб службе барысаўскага павятовага скарбніка С. Д. Гіндэнбурга за 1836 г. Арк. 75 адв.–76.

80. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 4. Спр. 1382. – Фармулярны спіс аб службе барысаўскага павятовага скарбніка С. Д. Гіндэнбурга за 1838 г. Арк. 127–128.

81. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 740. – Фармулярны спіс аб службе выканаўцы прац па складанні люстрацыйных актаў Кіеўскай губерні калежскага саветніка В. С. Гіндэнбурга ад 05.06.1884. Арк. 19–34.

82. НГАБ. – Ф. 134. Воп. 2. Спр. 14. – Фармулярны спіс аб службе і годнасці акушэра Мінскай урачэбнай управы надворнага саветніка штаб-лекара В. Д. Гіндэнбурга за 1845 г. Арк. 7 адв.–10.

83. НГАБ. – Ф. 134. Воп. 2. Спр. 14. – Фармулярны спіс аб службе і годнасці мазырскага павятовага лекара доктара медыцыны калежскага саветніка В. Х. Крумзіга за 1845 г. Арк. 22 адв.–26.

84. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 7. Спр. 210. – Фармулярны спіс аб службе канцылярскага чыноўніка Канцылярыі мінскага цывільнага губернатара калежскага асэсара С. Д. Гіндэнбурга за 1864 г. Арк. 137 адв.–144.

85. НГАБ. – Ф. 466 (Мінская мужчынская гімназія). Воп. 1. Спр. 501. – Фармулярны спіс аб службе чыноўніка па судовай частцы пры Віленскім акцызным упраўленні стацкага саветніка В. В. Гіндэнбурга за 1896 г. Арк. 3–8.

86. *Хурсік, В. У.* Род Офенбергаў у гісторыі Беларусі / В. У. Хурсік // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 6. – С. 38–45.

87. ЦДА Масквы. – АЗД да 1917 г. – Ф. 179. Воп. 50. Спр. 5882. – Справа аб выключэнні са спісаў службоўцаў галоўнага доктара Стара-Кацярынінскай бальніцы Л. В. Гіндэнбурга ў сувязі са смерцю. 10.02.1897–19.02.1897. 10 арк.

88. ЦДА Масквы. – АЗД да 1917 г. – Ф. 179. Воп. 50. Спр. 84. – Справа аб выклапатанні пенсіі на службе ў поўным акладзе аператару-кансультанту і спраўляючаму пасаду старшага лекара Стара-Кацярынінскага аддзялення бальніцы для чорнарабочых ў Маскве правадзейнаму стацкаму саветніку Л. В. Гіндэнбургу. 18.10.1888–05.08.1889. 17 арк.

89. ЦДА Масквы. – АЗД да 1917 г. – Ф. 418 (Імператарскі Маскоўскі ўніверсітэт). Воп. 1. Спр. 298. – Справа аб допуску ельнінскага павятовага лекара Смаленскай губерні штаб-лекара В. Д. Гіндэнбурга да экзамену на званне акушэра. 21.09.1832–16.11.1832. 7 арк.

90. ЦДА Масквы. – АЗД да 1917 г. – Ф. 418. Воп. 3. Спр. 5. – Справа аб допуску акушэра Мінскай урачэбнай управы штаб-лекара В. Д. Гіндэнбурга да экзамену на званне інспектара ўрачэбнай управы. 28.12.1833–28.08.1834. 11 арк.

91. *Чапко, В. У.* Развіццё Мінска ў 1793–1861 гг. / В. У. Чапко // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска: у 4 кн. / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 2001. – Кн. 1 / уклад. А. А. Ляўшэвіч, В. С. Семенякоў; навук. рэд. Г. В. Штыхаў. – С. 367–378.

92. *Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск: Беларусь, 2004. – 256 с.

93. Hemmerich, Karl Ludwig // Erik-Amburger-Datenbank: Ausländer im vorrevolutionären Russland [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://amburger.ios-regensburg.de/index.php?id=94864. – Дата доступу: 20.04.2021.

94. Karstadt, Samuel // Erik-Amburger-Datenbank: Ausländer im vorrevolutionären Russland [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://amburger.ios-regensburg.de/index.php?id=94990. – Дата доступу: 20.04.2021.

95. *Kośmiński, S.* Słownik lekarzów polskich obejmujący oprócz krótkich życiorysów lekarzy polaków oraz cudzoziemców w Polsce osiadłych, dokładną bibliografią lekarską polską od czasów najdawniejszych aż do chwili obecnéj / S. Kośmiński. – Warszawa: Nakład autora, 1883. – 684 s.

96. *Kowalewska, Z.* Obrazki mińskie. 1850–1863 / Z. Kowalewska. – Wilno: Nakład Księgarni Józefa Zawadzkiego, 1912. – 128 s.

97. *Pinkerton, R.* Russia: or, Miscellaneous observations on the past and present state of that country and its inhabitants. Compiled from notes made on the spot, during travels, at different times, in the service of the Bible Society, and a residence of many years in that country / R. Pinkerton. – London: Seeley & Sons, 1833. – 512 p.

**(Дата паступлення: 10.05.2021).**